Было яно ці не было, праўда ці няпраўда, — паслухаем лепш, што казка кажа. Ну дык вось. Прыляцеў у адзін край страшэнны Змей. Выкапаў ён сярод лесу ў гары глыбокую яму і лёг адпачываць. Доўга ён адпачываў ці нядоўга — ніхто таго не памятае. А як устаў, дык адразу на ўвесь край закрычаў:



— Гэй, людзі — мужыкі і кабеты, старыя і малыя. Насіце
мне кожны дзень даніну: хто гавядзіну, хто бараніну, а хто — свініну!
Хто прынясе, той жыць будзе, а хто не — таго Змей праглыне!
Напалохаліся людзі, пачалі насіць Змею даніну.



